Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП (б) Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 39 (53) Серада, 29 жніўня 1945 г.

## ПАВЫСІЦЬ ТЭМПЫ ЗБОЖЖАНАРЫХТОВАК

Калгаснікі, работнікі саўгасаў і МТС, сяляне-аднаасобнікі рэспублікі, у тым ліку сяляне нашага раёна, адказваючы на заклік кубанскіх хлебаробаў, уключыліся ва Ўсесаюзнае сацыялістычнае спаборніцтва за датэрміновае выкананне збожжанарыхтовак, своечасовае правядзенне азімай сяўбы і ўзялі абавязацельства выканаць гадавы план хлебанарыхтовак поўнасцю і датэрмінова да 25 кастрычніка 1945 года і правесці сяўбу азімых культур не больш чым у 20—25 рабочых дзён.

Слова савецкага чалавека—цвёрдае слова. Стрымаць яго павінна кожная сялянская гаспадарка. У надмацаванне абавязацельства ў нашым раёне усё шырэй разгортваецца здача збожжа дзяржаве. Выконваючы свой свяшчэнны абавязак перад Радзімай сяляне Галоўчыцкага сельсовета на 27 жніўня здалі 29 тон добраякаснага збожжа. Тут многія сяляне ўжо поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па збожжанастаўках. З кожным днём увялічваецца колькасць сялянскіх гаспадарак, якія датэрмінова разлічыліся з дзяржавай па хлебаздачы ў Дзеткавіцкім, Акцябрскім, Гарадзецкім і другіх сельсоветах раёна.

Але па вялікі жаль так справа абстаіць не ўсюды. Зусім марудна ідзе здача збожжа дзяржаве ў Дзямідавіцкім сельсовеце (старшыня т. Навічук). На 27 жніўня па сельсовету план збожжанарыхтовак выканан усяго на 19,1 працэнтаў. Гэтак жа адстаюць і такія сельсоветы, як Дзераўноўскі і Заніўскі.

Марудны ход выканання плана збожжанарыхтовак дзяржаве ў гэтых сельсаветах растлумачваецца перш за ўсё тым, што яшчэ тут слаба арганізавана сацыялістычная спаборніцтва за датэрміновае выкананне здачы збожжа, недастаткова разгорнута масава-палітычная работа сярод сялян, нездавальняюча арганізавана звозка хлеба з поля і малацьба.

Усе гэтыя недахопы неабходна неадкладна выправіць. Неабходна рашуча павысіць тэмпы збожжанарыхтовак. Не чакаючы добрага надвор'я, трэба арганізаваць сушку, масавую малацьбу і вывазку збожжа на пункты Заготзярно.

Хлеб з'яўляецца залатым фондам нашай краіны. Чым больш будзе здана хлеба краіне, тым магутней стане наша сацыялістычная Радзіма, тым хутчэй будуць залечаны глыбокія раны вайны, нанесеныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Датэрмінова разлічыцца з дзяржавай па збожжанарыхтоўках—святы абавязак сялян і сялянак.

### 4 ТОНЫ ЗБОЖЖА Ў ФОНД ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Шырыцца сацыялістычнае спаборніцтва сярод сялян Акцябрскага сельсовета за датэрміновую здачу збожжа дзяржаве. На 27 жніўня сяляне выканалі план збожжанарыхтовак на 36,9 працэнтаў.

Многія сяляне здаюць збожжа ў фонд Чырвонай Арміі. На 27 жніўня з сельсовета паступіла ў фонд Чырвонай Арміі 4 тоны збожжа новага ўраджаю.

## У Цэнтральным Камітэце КП(б)Б і Соўнаркоме БССР

У адпаведнасці з пастановай Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і Совета Народных Камісараў Саюза ССР,—Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі і Совет Народных Камісараў БССР абавязалі Дзяржаўную Планавую Камісію пры Совеце Народных Камісараў БССР сумесна з Народнымі Камісарыятамі і абласцямі скласці і прадставіць у ЦК КП(б)Б і СНК БССР пяцігадовы план аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі БССР на 1946—1950 гг., кіруючыся указаннем ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб тым, што „У пяцігадовым плане мае ца на ўвазе прадугледзець поўнае аднаўленне народнай гаспадаркі раёнаў СССР, якія падвергліся нямецкай акупацыі, пастаяннаму перабудову народнай гаспадаркі і далейшае развіццё ўсіх раёнаў СССР, у выніку чаго павінен быць значна перавышан даваенны ўзровень развіцця народнай гаспадаркі СССР“.

Кантрольныя намёткі пяцігадовага плана па гаспадарцы рэспубліканскага і мясцовага падпарадкавання прадставіць да 1 верасня 1945 года.

### ЗВОДКА
аб ходзе збожжанарыхтовак па раёну на 27 жніўня.

| №№ п/п | Назва сельсоветаў | Процант выканання |
|---|---|---|
| 1 | Дзеткавіцкі | 38,1 |
| 2 | Акцябрскі | 36,9 |
| 3 | Галоўчыцкі | 36,5 |
| 4 | Гарадзецкі | 33,5 |
| 5 | Худлінскі | 31,5 |
| 6 | Антопальскі | 30,0 |
| 7 | Аніскавіцкі | 27,7 |
| 8 | Асіпавіцкі | 26,7 |
| 9 | Каменскі | 26,1 |
| 10 | Ілаўскі | 24,3 |
| 11 | Першамайскі | 22,2 |
| 12 | Заніўскі | 20,7 |
| 13 | Дзераўноўскі | 20,4 |
| 14 | Дзямідавіцкі | 19,1 |

Па раёну: 28,3



# РАЁННАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ НАСТАЎНІКАЎ

З 26 па 28 жніўня ў раённым цэнтры праходзіла раённая канферэнцыя настаўнікаў.

На парадку дня канферэнцыі сталі пытанні:

1. Вынікі аднаўлення школ у раёне і задачы ў справе умацавання народнай асветы.

2. Вынікі работы школ па рэалізацыі пастановы СНК СССР ад 21 чэрвеня 1944 года аб мерапрыемствах па паляпшэнню якасці работы ў школе і задачы совецкага настаўніцтва.

Па першаму пытанню з дакладам выступіў старшыня выканкома райсовета дэпутатаў працоўных тав. Царыкаў.

— Нямецка-фашысцкія захопнікі,—гаворыць тав. Царыкаў,—зруйнавалі ў нашым раёне 22 школы, знішчылі ўсе вучэбнікі і школьную маёмасць. Пасля выгнання гітлераўскіх бандытаў разгарнуліся аднаўленчыя работы. Пры ўдзеле совецкай грамадскасці ў аднаўленчых работах у нашым раёне ў мінулым годзе была адноўлена 51 школа.

У 1945-46 навучальным годзе будзе працаваць 53 школы, у якіх павінна навучацца 5118 дзяцей.

Падвёўшы вынікі падрыхтоўкі школ да навучальнага года, дакладчык прывёў многа прыкладаў самааддапай працы настаўнікаў, праявіўшых ініцыятыву ў рамонце школ, нарыхтоўцы паліва і інш. Да такіх адносяцца загадчык Сукачскай пачатковай школы тав. Юдчыц, дырэктар Галоўчыцкай НСШ тав. Ваўрук і другія.

Між тым, у выніку халатных адносін да работы асобных загадчыкаў школ і кіраўнікоў сельсоветаў, дрэнна падрыхтаваліся да навучальнага года Акцябрская НСШ, Вулькаўская і Каменская пачатковыя школы, Дзераўнянская і другія.

Неабходна сур'ёзную ўвагу звярнуць на падрыхтоўку школ да новага навучальнага года, ахапіць навучаннем усіх дзяцей.

Па другому пытанню канферэнцыя заслухала даклад загадчыка раённага аддзела народнай асветы тав. Салановіча. Большая частка даклада была ўдзелена метадам і якасці навучальна-выхаваўчай работы ў школе. Дакладчык астанавіўся на недахопах у рабоце школ раёна.

Па дакладах разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Дырэктар Антопальскай сярэдняй школы тав. Грабоўскі расказаў аб поспехах навучальнай і выхаваўчай работы ў сваёй школе, таксама ўказаў на тое, каб настаўнік работаў над сабой, толькі тады будзе пастаўлена выхаванне вучняў на належную вышыню. Ён высунуў прапанову аб арганізацыі метадычных кустоў пры сельсоветах.

Многія настаўнікі гаварылі аб падрыхтоўцы школ да новага навучальнага года. Дырэктар Галоўчыцкай НСШ тав. Ваўрук адзначыў тое, што мала аказваюць дапамогі ў падрыхтоўцы школ раённыя арганізацыі. Аддзел народнай асветы не своечасова адпускае сродкі на рамонт школ, райпромкамбінат не аказвае дапамогі ў набыцці неабходнага абарудавання.

У сваім выступленні настаўнік Антопальскай СШ тав. Козел звярнуў увагу на завочнае навучанне настаўнікаў. Тав. Краўцоў (загадчык Дзятлавіцкай школы) і Міхальчук (Іменінская школа) падзяліліся вопытам пастаноўкі масава-палітычнай работы сярод насельніцтва і адзначылі, што аддзел прапаганды і агітацыі РК КП (б) Б не ўцягвае настаўнікаў у масавую работу. Выступаючыя адзначалі, што да гэтага часу сярод настаўнікаў не арганізаваны прафсаюзы, крытыкавалі раённы гандлёвы аддзел, які дрэнна забяспечвае настаўнікаў прадуктамі.

У прынятых канферэнцыяй рэзалюцыях намечаны канкрэтныя мерапрыемствы па павышэнню якасці навучальна-выхаваўчай работы ў школах.

На канферэнцыі былі прачытаны лекцыі метадычнага характара.

## ПА СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ



Цімкавіцкая МТС, Бабруйскай абласці, першай у Беларускай рэспубліцы выканала гадавы план трактарных работ. Першынства заваявалі былыя партызаны Беларусі трактарысты Васілій Лобан і Васілій Сакалоўскі, спаборнічаючыя са знатнай трактарысткай Дар'яй Гармаш. Яны на трактары „ХТЗ“ узаралі 790 гектараў і зэканомілі 1.350 кілограм гаручага.

На здымку: трактарыст Васілій Лобан.

Фотахроніка ТАСС.

### СЯЎБА АЗІМЫХ

Перадавыя калгасы Палескай абласці паспяхова праводзяць сяўбу азімых. На 18 жніўня калгас „Чырвоныя Лукі“, Васілевіцкага раёна, засеяў 93 гектары азімых. 46 гектараў засеяў калгас імені Сталіна.

Усяго па абласці засеяна больш 700 гектараў азімых.

* * *

Звыш 500 калгасаў Магілёўскай абласці пачалі сяўбу азімых.

Азімыя засяюцца на добра апрацаванай угноенай глебе. У адным толькі калгасе „Зорка Першага мая“, Горацкага раёна вывезена ў поле пад азімыя 200 тон торфу.

Усяго па абласці азімымі засеяна звыш 4 тысячы гектараў.

В. а. рэдактара
П. СПІРЫДОНАЎ.

ГЛ 14860 Адрас рэдакцыі: г. Антопаль, Совецкая вуліца, дом №2